## Стылі і тыпы маўлення

1. Вызначце па кампазіцыйнай будове тэксту тыпы тэкстаў. Для гэтага выберыце правільны варыянт з прапанаваных.

| | | |
|---|---|---|
| Агульнае ўражанне ад прадмета, з'явы і г.д. Прыметы ці ўласцівасці прадмета, з'явы і г.д. Ацэнка прадмета, з'явы. | Тэзіс. Аргументацыя. Вывад. | Пачатак дзеяння. Развіццё дзеяння з кульмінацыяй. Канец дзеяння. |

**2.** Адзначце сярод прыведзены прыметы **публіцыстычнага стылю:**

адрасат тэксту з'яўляецца масавым;

галоўная функцыя тэксту – перадача навуковай інфармацыі;

ужываецца пераважна абстрактная лексіка;

тэкст уяўляе сабой свабоднае, натуральна арганізаванае маўленне, якое характэрна для мастацкіх твораў розных жанраў: раман, аповесць, апавяданне;

асноўная задача аўтара тэксту – паведаміць інфармацыю і ўздзейнічаць на думкі чытача, выклікаючы пэўны водгук;

матэрыял тэксту пададзены лаканічна, даходліва; характэрныя яму ацэначнасць і вобразнасць тлумачацца тым, што аўтар, перадаючы інфармацыю, выражае да яе сваё стаўленне;

тэксту ўласцівы інфармацыйная насычанасць, канкрэтнасць;

выклад зместу падкрэслена лагічны (паслядоўны, звязны);

выказванне інфармацыйна насычанае, пры гэтым сціслае, дакладнае, канкрэтнае;

яго галоўная асаблівасць – адзінства рэалізацыі камунікатыўнай і эстэтычнай функцый: словы не толькі перадаюць пэўны змест, але і, з'яўляючыся сродкам фарміравання мастацкіх вобразаў, уздзейнічаюць на думкі і пачуцці чытача;

эмацыянальнасць, вобразнасць, яркасць тэксту надаюць вобразна-выяўленчыя сродкі: параўнанні, эпітэты, метафары і г.д.

LIVEWORKSHEETS